**24.** Размеркаванне слоў па часцінах мовы адбываецца паводле:

*1) агульнасці граматычных катэгорый;*
*2) асаблівасці словазмянення;*
*3) спалучальнасці з іншымі словамі;*
*4) падабенства асноўных сінтаксічных функцый.*

Вызначце правільныя варыянты.

**А)** усе варыянты. **Б)** усе варыянты, акрамя 4. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**25.** Які від дадзенай часткі ў дадзеным складаным сказе?

*У памяці засталіся хвіліны, калі на рукі падалі незвычайнай формы сняжынкі.*

**А)** дзейнікавая. **Б)** выказнікавая. **В)** азначальная.
**Г)** дапаўняльная. **Д)** акалічнасная.

**26.** *Злучальныя галосныя ў складаных словах* называюцца … .

**А)** прыстаўкі. **Б)** суфіксы. **В)** постфіксы.
**Г)** інтэрфіксы. **Д)** няма навуковай назвы.

**27.** Да якога разраду адносіцца выдзеленая часціца ў сказе?

***Няўжо** ты такі дужы?*

**А)** у сказе няма часціцы. **Б)** сэнсавая часціца. **В)** мадальная часціца.
**Г)** эмацыянальная часціца. **Д)** формаўтваральная часціца.

**28.** Дадзены лексічныя значэнні ўстойлівых спалучэнняў:

*1) умешвацца не ў сваю справу; 2) спыняць актыўнасць;*
*3) смяяцца; 4) змокнуць дарэшты; 5) глядзець без мэты.*

Якое значэнне адпавядае ўстойліваму спалучэнню *сушыць зубы*?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**29.** Хто з вядомых паэтаў сказаў: *"Над намі словы ўладараць…"*?

**А)** А. Вярцінскі. **Б)** М. Стральцоў. **В)** А. Грачанікаў.
**Г)** А. Разанаў. **Д)** С. Грахоўскі.

**30.** Алаіза Пашкевіч многія творы падпісвала псеўданімам Цётка. Якія яшчэ псеўданімы мела пісьменніца? Выберыце правільныя варыянты:

*1) Мацей Крапіўка; 2) Гаўрыла з Полацка; 3) Ганна Аршыца;*
*4) Алеся Гаротная; 5) Падпольнік.*

**А)** няма правільных варыянтаў. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3.
**Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by
http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 12. Тыраж 11500 экз. г. Мінск. 2012 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2012»

*Чацвер, 16 лютага 2012 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/.

---

## Заданне для вучняў 9 класаў

**1.** Якой назвы народнага свята не хапае ў вершаваных радках Уладзіміра Дубоўкі?

*Ёсць цудоўнае паданне, ад паўночы да світання*
*як на свята, на …, кветку Шчасця ў нас шукалі.*

**А)** Каляды. **Б)** Гуканне Вясны. **В)** Купалле. **Г)** Узвіжанне. **Д)** Тройцу.

**2.** Пра якую расліну ў народзе існуе загадка: *два тыдні цвіце, чатыры тыдні спіць, а на сёмы тыдзень насенне спее*?

**А)** пра жыта. **Б)** пра авёс. **В)** пра валошку. **Г)** пра лён. **Д)** пра чабор.

**3.** *У літаратурным творы сродкам стварэння вобразаў* з'яўляецца ... .

**А)** гук. **Б)** слова. **В)** сцэнарый. **Г)** мелодыя. **Д)** фарба.

**4.** Героямі якога літаратурнага твора з'яўляюцца Лаўрук і пан Шчубальскі?

**А)** твора Янкі Брыля "Сірочы хлеб".
**Б)** твора Змітрака Бядулі "На Каляды к сыну".
**В)** твора Васіля Быкава "Незагойная рана".
**Г)** твора Якуба Коласа "Дзеравеншчына".
**Д)** твора Янкі Маўра "Палескія рабінзоны".

**5.** Які адпаведнік у беларускай мове мае ўстойлівае спалучэнне з рускай мовы *вышел сухим из воды*?

**А)** дарма прайшло. **Б)** дармавога нічога на свеце няма.
**В)** даваць лататы. **Г)** дарма сабе. **Д)** дацца ў знакі.

**6.** Які адпаведнік у беларускай мове мае назоўнік з рускай мовы ***манжета***?
**А)** абшыванка. **Б)** абшэўка. **В)** шывок. **Г)** аздоба. **Д)** ворчык.

**7.** Дадзены прыметнікі:
*1) марацкі; 2) гарацкі; 3) гарняцкі; 4) рыбацкі; 5) сусецкі.*
Якія з іх правільна запісаны?
**А)** усе прыметнікі. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**8.** Вызначце тып прыведзенага сказа:
*Зазвіняць жалобна крыгі, Снег, размоклы ў час адлігі,*
*І бурлівая вада Змые з луга без сляда* (Максім Багдановіч).
**А)** просты сказ. **Б)** складаназлучаны сказ. **В)** складаназалежны сказ.
**Г)** складаны бяззлучнікавы сказ. **Д)** складаны сказ з рознымі відамі сувязі.

**9.** У якім(-іх) сказе(-ах) з прапанаваных на месцы пропуску не трэба ставіць коску:
*1) Толькі верхавіны елак ледзь чутна гулі_ ды шалясцелі трапяткія асіны.*
*2) У лесе было цёпла_ аднак пах восені ўжо быў чуваць усюды.*
*3) Праз нейкі час вецер разагнаў хмары на небе_ і дождж сціх.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 2. **Г)** 2. **Д)** 1, 3.

**10.** У паэме “Слова пра паход Ігаравы” аўтар расказаў пра бітву, што адбылася на рацэ … .
**А)** Свіслач. **Б)** Няміга. **В)** Лоша. **Г)** Пціч. **Д)** Днепр.

**11.** Назоўнік *атрамант* – устарэлы. Якое слова выкарыстоўваецца замест яго сёння?
**А)** буквар. **Б)** кніга. **В)** сшытак. **Г)** чарніла. **Д)** аловак.

**12.** У якіх сказах з дадзеных адасабляецца дзеепрыметнікавы зварот?
*1) На лузе пакрысе падсыхала скошаная хлопцамі трава.*
*2) Заўсёды пераходзьце дарогу ў месцах абазначаных знакам пераходу.*
*3) У нагрэтым ліпеньскім сонцам бары пахла смалой.*
*4) Машыны нагружаныя збожжам ехалі па селавой дарозе.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**13.** У якім(-іх) сказе(-ах) выдзеленыя словы напісаны правільна?
*1) У* ***дзядулевам*** *садзе выраслі яблыні.*
*2) Янка выбег на двор і прынёс* ***вялікі ахапак*** *рамонкаў.*
*3) Над* ***новым верф’ю*** *лёталі птушкі.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2. **Д)** 2, 3.

**14.** Якія з дадзеных прыслоўяў напішаце разам?
*1) у_бок; 2) на_ век; 3) у_ начы; 4) па_ціху; 5) у_двая.*
**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** усе, акрамя 1.
**Г)** 1, 2, 5. **Д)** 3, 4.

**15.** Вызначце словы з прыведзеных, у якіх колькасць літар і гукаў супадае:
*1) сшыць; 2) цётчын; 3) французскі; 4) сённяшні; 5) сям’я.*
**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 5. **В)** няма правільных варыянтаў.
**Г)** 1, 3, 4. **Д)** 2, 5.

**16.** Дадзены назоўнікі:
*1) азімыя; 2) дровы; 3) хітрыкі; 4) вячоркі; 5) гоні.*
Якія з іх ужываюцца толькі ў множным ліку?
**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 4.

**17.** Дадзены сказ: *Хату* ***зрабіць*** *– не скрынку збіць.*
Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова?
**А)** дапаўненнем. **Б)** азначэннем. **В)** акалічнасцю.
**Г)** дзейнікам. **Д)** выказнікам.

**18.** У якіх словах з прапанаваных патрэбна напісаць ***ь***?
*1) шэсц..сот; 2) агледз..ся; 3) раз..бяр; 4) ледз..ве; 5) чагос..ці.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4, 5.

**19.** Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае ў сказе слова?
***Вакол*** *дрэва ляжала апаўшае за дзень лісце.*
**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** прыслоўем.
**Г)** прыназоўнікам. **Д)** злучнікам.

**20.** Выберыце з прапанаваных словы, якія патрэбна напісаць праз злучок:
*1) жылі..былі; 2) хлеб..соль; 3) сяды..тады; 4) сям..там; 5) сам..насам.*
**А)** няма правільных варыянтаў. **Б)** усе словы.
**В)** 1, 2, 3. **Г)** 1, 3, 4. **Д)** 4, 5.

**21.** У якіх сказах з дадзеных патрэбна выдзеліць выклічнікі коскай?
*1) Эх сябры якое раздолле на лузе! 2) Ну бывайце шчаслівай дарогі.*
*3) Гэ-гэй пайшлі ўжо! 4) О колькі радасці дзецям зімой!*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3.
**Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**22.** У якім сказе з прыведзеных патрэбна паставіць на месцы пропуску працяжнік?
*1) І дачакаўся _ летам каля крыніцы можна пасядзець у цяньку.*
*2) Дай сну волю _ праспіш шчасце, долю.*
*3) Калі канчаецца сонечная паляна _ пачынаецца густы бярэзнік.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**23.** Дадзены словы:
*1) смех; 2) тлушч; 3) алешнік; 4) вугаль; 5) гонар; 6) лістота.*
Выберыце толькі рэчыўныя назоўнікі.
**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 6.